The Byelorussian Times

ЧАС
Двумоўны беларускі
часапіс у З.Ш.А.

No.40, Vol.7, USPS 345–170 November 1982 9-06 Parsons Blvd., Flushing, N.Y. 11357 Price $1.35

KGB'S ROLE IN NAZI ACCUSATIONS REVEALED

For a long time Western experts suspected that the KGB (the Soviet secret police) played an active role in fabricating and disseminating false information against emigre groups in the West to discredit them, and in instigating unrest and turmoil in their secular and religious organizations to destroy or to fragment them.

However, it is only recently that these suspicions have been substantiated in a deposition of a former KGB agent which was filed in a United States court.

According to the *Chicago Latvian Newsletter* of September 1982, the *Chicago Tribune* and the *Chicago Sun Times* of June 1982, Imants Lesinskis, a former Latvian KGB agent who defected to the U.S. in 1978, gave written testimony on June 23, 1982, in Chicago at the trial of Liudas Kirys who had been charged with "Nazi war crimes" during W.W. II. Lesinskis' personal appearance at the trial was prevented by security considerations, but in his written statement Lesinskis charged that the recent wave of Nazi trials in the U.S. is the result of Soviet fabrications. He described how in the late 1960's the KGB gave top priority to "engage in propoganda work against Latvian emigre communities in the free world."

To accomplish this, Lesinskis said, the KGB manufactured phony war crimes cases against top Latvian leaders in the U.S. and then released the falsified information to Israel and the West. "This was done to discredit them in the eyes of the Latvian community abroad, to discredit them before the Latvian people at home, and to discredit them in the eyes of public opinion in Western countries." — He continued.

Testifying about his own personal involvement in such fabrications, Lesinskis said:

"To describe (the Latvian leaders) as war criminals or having membership in organizations led by war criminals, was one lie."The second lie was to describe nationalist organizations in the West as "acting under orders of Western intelligence agencies."

Although, on the basis of his personal knowledge, Lesinskis could testify only about KGB activities against Latvians, many knowledgeable people believe that similar campaigns have been waged against other nationalities presently enslaved by the Russians and that the current "Nazimania" in the U.S. media against Byelorussians can be traced to the KGB.

On May 16, 1982, and again on September 12, 1982, in its television program called "60 Minutes", the CBS Television Network accused "more than 300 Byelorussians living in the U.S. today" of being "Nazi war criminals." The host of the program was Mike Wallace and the witness making most of these accusations was John Loftus, a former employee of the U.S. Office of Special Investigations. It was apparent from the program that Loftus was using some of the falsified Soviet-supplied information. (See *Byelorussian Times*, No.38–39).

A question, "how does the KGB manage to manipulate U.S. media and people like Wallace and Loftus?", has been raised by M.E. Arch in his letter to the editor of *Bielarus*, Aug.-Sept. 1982. He then proceeds to answer the question. "This is best described in the recently published book by James L. Tyson, entitled *Target America: The Influence of Communist Propoganda on U.S. Media.* The Communists are masters of propoganda and disinformation and CBS gave the Soviet disinformation experts — the KGB's Disinformation Directorate — a national platform. It appears that Loftus has been relying on this Soviet source for some of his *facts.* Loftus and Wallace should have been more than casually aware that the Soviets have a long history and unparalleled expertise in the forgery of documents — for political show trials, feeding gulags with fresh candidates... (and they) also use forgery as a routine propoganda tool...."

With respect to Mr. Loftus himself, it is clear that he knows pitifully little about Byelorussia generally and even less about Byelorussian history during the Second World War. He is an amateur in the field of Soviet disinformation and may have an interest to publicize a sensational book he has written allegedly about Byelorussian Nazis.

We might add, that Loftus' former boss, Alan Ryan who heads the Office of Special Investigations says that "there is no basis for Loftus' charges" about Byelorussian Nazis living in the U.S. There is, however, a close and a revealing coincidence between the words of former KGB agent Lesinskis that the KGB seeks to portray the nationalist organizations and their leaders in the West as "acting under orders of Western intelligence agencies" and Loftus' allegations that, allegedly, the U.S. "spy agencies" "imported" Byelorussian war criminals to the U.S. after the Second World war.

Polish chauvinists claim Byelorussian territory

An organization of Polish chauvinists called the "Stronitstvo Narodovego" (SN) held its world congress this June in London, England. SN still claims to represent the Polish people and in its time it represented an organized opposition to the Polish dictator Pilsudski.

As stated in its foreign policy resolution adopted at the congress, SN regards the "legal Polish frontiers" on the east to be those established by the Riga Peace Conference between Poland and Russia on March 18, 1921. The resolution further states: "The renounciation by some circles of the lands beyond the River Buh including the cities of Vilna (Byelorussian—editor) and Lvow (Ukrainian — editor) in favor of the future hypothetical Ukraine, of Byelorussia or Zhamoyc (so-called Lithuania) is tantamount to their renounciation to the Soviet Union. Any discussion of the eastern Polish frontiers with ethnic groups of other nationalities only weakens our position...."

Commenting on this resolution, the "Polish Voice" of Toronto characterized it as a "sane position with regard to the eastern frontiers."

For those not familiar with the Riga Peace Conference of 1921, it should be stated that at that conference Poland received western Byelorussia and western Ukraine and in return agreed to guarantee to the occupied Byelorussians and Ukrainians all rights which would insure a free development of their cultures, languages, religions and, to this end, agreed to establish Byelorussian and Ukrainian schools, associations and societies. Poland, however, reneged on its promise and conducted a notorious occupational policy in western Byelorussia and western Ukraine up to the Second World War and this occupational policy continues today in the Byelorussian Bielastok Province still held by Poland.

CENTENNIAL OF BYELORUSSIAN POETS IANKA KUPALA AND IAKUB KOLAS

The Slavonic Division of the New York Public Library is celebrating the centennial of the birth of two major Byelorussian writers, Ianka Kupala and Iakub Kolas, with an exhibition from September 3 to November 30, 1982.

Ianka Kupala, the pseudonym for Ivan Lutsevich (1882–1942), devoted his considerable poetic and dramatic talents to the restoration of human dignity and national pride for the Byelorussian people in the early 1900's. His plays, most notably "Paulinka", laid the foundation of Byelorussian theater, while his narrative poems opened new romantic styles in Byelorussian literature.

Iakub Kolas, born Kastus Mitskevich (1882–1956), drew much of his inspiration from the folk traditions of the Byelorussian people. His greatest creation was the epic poem "Novaia Ziamlia" (The New Land) which has become a classic work of the Byelorussian literature. Prolific and talented, Kolas was also renowned for his fictional works, some of which are autobiographical in nature.

The exhibit includes numerous first editions, manuscripts, collected works, pictorial works, miniature books and recently published commemorative material, which are part of the most extensive Slavonic collection of writings by and about Kupala and Kolas in the United States.

"Centenial of Byelorussian Poets: Ianka Kupala and Iakub Kolas" may be seen daily, during library hours, in the Central Research Library at Fifth Ave. and 42 St. in Manhattan.





КАЛЯДНАЕ АРХІПАСТЫРСКАЕ ПАСЛАНЬНЕ
Сабору Япіскапаў Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы

Дастойнаму Сьвятарству і ўсім Багалюбным Вернікам Народу Беларускага На Бацькаўшчыне й на Чужыне

„І вось Зорка, якую бачылі яны на ўсходзе, ішла перад імі аж пакуль прыйшоўшы не супынілася над месцам, дзе было Дзіцятка.”
(Мац. 2,9)

ХРЫСТОС НАРАДЗІЎСЯ – ЯГО СЛАЎЦЕ!

Дарагія Браты й Сёстры!

Гэтая ціхая Зорка гарыць і цяпер над убогай пячорай Віфліему, дзе на саломе ў ясьлях ляжала Дзіця Божае, прыняўшы на сябе грахі ўсяго сьвету, усе несправядлівасьці й неразважнасьці людзкія. Госпад наш Ісус Хрыстос прыйшоў да нас, каб мы прыйшлі да Яго, каб духова вольнымі быць ад злачынаў нашых.

У небе зьяе Віфліемская Зорка. Яна анавясьціла вяшчуном аб нараджэньні Таго аб Якім прарочылі прарокі, каго чакалі ня толькі людзі але й усялякае стварэньне. Аб Якім марыла ўсе чалавецтва, не знаходзячы выхаду з свайго бязладзьдзя як у філязафічнай навуцы, у няведамых яшчэ краінах і ў будове бабілёнскіх вежаў.

Для чалавецтва існуюць дзьве зоркі. Віфліемская Зорка – спасеньня, як праменьні нашага жыцьця; і цемна-крывавая зорка паганскага Малоха. Пад гэтымі зоркамі і мы жывем у сучаснасьці. І той, хто зракаецца Сьвятла Хрыстовага, сьв. Царквы, хто змагаецца з навукаю Хрыстоваю, той глядзіць і мае надзею на акрываўленую зорку, а не на Бога жывога. Нашым абавязкам есьць надзеяцца „на Славу на Вышынях Богу й на зямлі Мір людзям добрай волі” (Лук. 2,14).

І Зорка дабраслаўная, Зорка Хрыстовая ўзмоцніць нас, ачысьціць ад усяго ліхога й зьліквідуе паўстаўшыя нялады ў нашай Сьвятой БАПЦаркве. Зорка Дабраслаўленьня зьяе ў цемры нашае ночы, якая ёсьць ратункам і паказьнікам, як даравць адзін аднаму крыўды і мы мусім ісьці за гэтаю Зоркаю.

Таму не марнуйма часу й не трацьма надзеі на дапамогу Віфліемскае Зоркі. Бог справядлівы, Абаронца пакрыўджаных і надзея для сумуючых. Да Яго зварочваймося са шчыраю малітваю й Ён пашырыць Сваю Праўду на зямлі. „Я той, што дасьледжвае нутро й сэрца. І дам вам кожнаму паводле дзел вашых” (Адкр. Яна Баг. 2,23). „І надыйдзе час, калі пабожныя будуць цешыцца з Славы Ягонае” (Пс. 149,5). І калі мы будзем верыць, што „паводле веры нашае станецца нам” (Мац. 9,29), то народжаны Хрыстос Бог наш пераможа злосьць людзкую й пашле жыцьцё вечнае тым, хто надзеяцца на Яго.

У нашыя часы надмернага матэрыялізму, а таксама й маральнага заняпаду, усе сілы пекла выйшлі са сваіх сховішчаў, каб перамагчы Сьвятло Хрыстовае, Сьвятло любові, Дабра й Праўды, а гэтым самым і права чалавека.

Змаганьне з сіламі цемры адбываецца па ўсяму сьвету з асаблівую сілаю, а асабліва ў краінах апанаваных бязбожнымі кіраўнікамі, якія пашыраюць разбуральную рэлігійную дзейнасьць з дапамогаю прэсы, радыё, тэлевізыі й нязгоднаю з праўдаю прапагандаю.

Але як не намагаюцца ворагі Сьвятло Хрыстовае пагасіць, якое зазьяла ў Віфліеме, яно будзе сьвяціць вечна, бо праз Нараджэньне Хрыста Спаса, запачаткавана новая эра ў гісторыі сьвету й запачаткаваны пачатак перамогі Сьвятла над цемраю, дабра над злом. „Няма-ж іншага імя пад небам, дадзенага людзям якім-бы нам спасьціся.” (Дзеян. 4,12).

Нажаль зло яшчэ пануе на зямлі. Варожасьць усё яшчэ квітнее. Людзі ў бальшыні яшчэ блудзяць па фальшывых шляхох. Хочуць асягнуць мір-супакой шляхам войнаў, змаганьня і сварак. А ці-ж гэта не шлях злога духа дзеля агульнага зьнішчэньня Царквы й ладу па сьвеце? Мір-жа й супакой Божы, ёсьць асноваю Валадарства Божага на зямлі, і павінен быць у сярэдзіне нас, у нашых сэрцах і здабываецца супакой не варожасьцю, а згодаю й любоўю. Вось такога міру-супакою мы жадаем Вам у часе Сьвятых Дзён Раства Хрыстовага.

Няхай згода й любоў стала прабывае між намі й робіць нашае жыцьцё радасным, а Новы Год няхай адкрые нам новыя крыніцы шчасьця. А Нованароджаны Хрыстос Бог наш няхай пашле Народу Беларускаму шматкаштоўны Свой Скарб Мір-Супакой і Ласку Вам і ўсяму Беларускаму Народу на Радзіме.

З гэткімі нашымі думкамі й сардэчнымі пажаданьнямі вітаем Вас Усячэсныя Айцы й Багалюбныя Вернікі з Вялікім і слаўным Сьвятам з Раством Хрыстовым і з надыходзячым Новым Годам!

Ласка й Супакой Нованароджанага Госпада нашага Ісуса Хрыста, любоў Бога й Айца й лучнасьць Сьв. Духа няхай будзе з усімі Вамі, цяпер і заўсёды навек вякоў. Амін.

Каляды, Лета Божага 1983.
З ЛАСКІ БОЖАЕ
Пакорны ў Богу +Мітрапаліт Андрэй
Пакорны ў Богу +Япіскап Ізяслаў

ТЫДЗЕНЬ ПАНЯВОЛЕНЫХ НАРОДАЎ У МЭЛЬБУРНЕ

У нядзелю 19-га верасьня, 1982 г., з нагоды Тыдня Паняволеных Народаў, як і ў мінулыя гады, быў адслужаны „Экамунічны Малебен” у Саборы сьв. Патрыка – адным з найбольшых у Мэльбурне. Падчас Малебну саслужылі каля 20-ці сьвятароў рэпрэзэнтуючы Праваслаўную, Пратэстанцкую, Лютэранскую й Рыма Каталіцкую Цэркві на чале з Архіяпіскапам Ф. Літтле. БАПЦаркву рэпрэзэнтаваў а. Аляксандар, настаяцель Парафіі ў Мэльбурне.

Сабор быў перапоўнены народам розных нацыянальнасьцяў і веравызнаньняў. Падчас Малебну, Беларусы й прадстаўнікі іншых нацыянальнасьцяў у нацыянальных вопратках, трымалі свае нацыянальныя сьцягі. Сп-ня Надзя Груша чытала малітву на беларускай мове. Іншыя малітвы чыталіся на Армянску, Баўгарску, Эстонску, Харвацку, Чэску, Мадзярску, Жамойдзку, Латвійску, Польску, Расейску, Славацку, Украінску, і Ветнамску.

Па заканчэньні Малебна, вялікая колькасьць народу, дэманстрацыйна, із сьцягамі й плакатамі, пайшла на „Гарадзкую Плошчу” дзе выказваліся гарачыя прамовы супраць паняволынікаў – заклікалася да змаганьня ў абароне незалежнасьці ўсіх народаў.

Гэтыя падзеі былі апублікованыя ў месцай прэсе й часткова паказваліся па тэлевізіі.

– а. А. Кулакоўскі

„РАССТРЫЖАНАЯ” СУСТРЭЧА

НЮ БРУНСВІК, Ню Джэрзі 15-я Сустрэча Беларусаў Паўночнае Амэрыкі адбылася ў Ню Брунсвіку, Ню Джэрзі, 4–6 верасьня 1982 году. Арганізатары, як і раней, былі Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне (БАЗА) й Згуртаваньне Беларусаў Канады (ЗБК).

На гэтую Сустрэчу, так як і на папярэднюю, 14-ю, арганізатары не захацелі запрасіць Першагерарха БАПЦ, Мітрапаліта Андрэя, але не забыліся запрасіць расстрыжанага былўшага сьвятара Аляксандра Яноўскага каторы там для іх маліўся.

Інакш кажучы, арганізатары замянілі Галаву Царквы на расстрыгу й недзе па дарозе зусім згубілі рэшткі свайго гонару.

Polish Flags Destroyed in Bielastok

It was reported in the press that this year's observance of the traditional communist May Day holiday near the Polish-occupied city of Bielastok in western Byelorussia has been transformed into an anti-Polish demonstration.

A group of schoolchildren and students who were supposed to march in the May Day parade carrying Polish red and white flags, as if on signal, tore these flags and carried them in shreads and pieces. New flags were provided to the marchers, but these too were destroyed.

Another group marched in the parade barefooted as a sign of disrespect to the Polish state. Several arrests followed.

The Polish red and white flag symbolizes not only the Polish Peoples' Republic (Communist Poland), but it is also recognized by anti-communist Poles. This was the official Polish flag between the two World Wars and it has been unheard of that any Pole would destroy that flag.

The flag destroyers in Bielastok no doubt were Byelorussians and this act represents additional evidence of unrest among Byelorussians in their Polish-occupied Bielastok Province.

БАНДЫТЫЗМ У КЛІЎЛЕНДЗЕ ПАЎТАРЫЎСЯ

КЛІЎЛЕНД, Огаё У начы з 8-га на 9-га кастрычніка г.г., няведамыя асобы парэзалі нажом і зусім зьнішчылі ўсе чатэры апоны на машыне належучай Уладыку Ізяславу. Уладыка Ізяслаў прыехаў у Кліўленд на Сабор Япіскапаў БАПЦ які адбыўся ў рэзыдэнцыі Мітрапаліта Андрэя каля Царквы Жыровіцкае Божае Маці ў Кліўлендзе.

Машына Ўладыкі Ізяслава стаяла на пляцы каля суседняе пратэстанцкае царквы паміж іншымі машынамі. Пратэстанты, даведаўшыся аб гэтым бандыцкім учынку, былі моцна занепакоеныя й казалі, што ў іх ніколі нічога падобнага раней не сталася.

Прыблізна два гады раней, таксама ў „беларускім” Кліўлендзе, невядомыя асобы былі прапаролі ўсе чатэры апоны ў машыне Ўладыкі Ізяслава.

У ПАРАДКУ ВЫЯСЬНЕНЬНЯ

У газэце *Беларус*, №303-304 за верасень г.г., паявіўся „ліст” сп-ні Зіны Станкевіч, Рэдактара тэй-жа газэты, у якім яна ідзе сьледам тых няшчасных, што сяньня ніяк ня могуць стрымацца, каб ня кінуць нечым жахлівым на нашага Першагерарха, Мітрапаліта Андрэя.

Справа ў тым, што нехта ў Таронта на допыце безадказна і беспатрэбна прыгадаў імя с.п. Ст. Станкевіча, як таго, хто быццам ачольваў у нас групу „нацыстаў”. Усім ведама, што няма ў гэтым на грош праўды, бо партыяй нацыянал-сацыялістых у нас кіравалі Акінчыц і Казлоўскі – абодва загінулі ў 1943 г.. Др. Ст. Станкевіч ніколі да тэй групкі (ня больш 10 чалавек) не належаў і, па сваіх поглядах, ня мог належаць.

Калі ўжо нехта недзе сказаў недарэчнасьць, дык ці абавязкава трэба яе падхапіць і разгаласіць на ўвесь сьвет? А каб ня тыя мікалаевы гора-„пасланьні”, ды „ліст” сп-ні Станкевічыхі ў *Беларусе*, ніхто пра той ляпсус і ня ведаў-бы, акрамя пару чалавек у Таронта. Хто-ж гэта тады робіць „прапаганду савецкім паклёнам” і „асьветчаньням” пакорнага службы Масквы Джона Лофтуса, як не сама сп-ня Станкевіч!?

Але галоўнае прычым тут „вядучыя гіерархі”, як піша аўтарка „ліста”, – а ў нас-жа іх адзін, г.зн. Уладыка Мітрапаліт. Што ён можа мець супраць асобы нябожчыка Ст. Станкевіча? А нічога! Наадварот, Уладыка мае ў сэрцы самы цёплы пра яго ўспамін. Бо да таго, што прыгадала сама сп-ня Станкевіч, і з чым нельга не згадзіцца, трэба яшчэ дадаць, што нябожчык быў *адзіным* нашым каталіком, які з глыбокім перакананьнем публічна абвяшчаў, і пісаў у сваёй газэце, што „найвялікшым дасягненьнем беларускай эміграцыі было адраджэньне БАПЦ”. Сказаць так, шчыра прызнаць гэтую вялікую праўду мог толькі чалавек вялікай душы, чыстай вады ідэаліст, чалавек немалой цывільнай адвагі. Такім мы ўсе яго памятаем і молімся за супакой яго душы. Таму ставіць Уладыку Мітрапаліту нейкі закід „людзкой злосьці” ёсьць нятолькі беспадстаўна, але і зусім не на месцы.

Калі ўжо гутарка пра адносіны газэты *Беларуса* да БАПЦ, дык варта запытацца, чаму гэта цяпер, калі рэдактарам газэты стала праваслаўная удава па Ст. Станкевічу, дык ні пасланьні Ўладыкі Мітрапаліта, ні паведамленьні Кансысторыі БАПЦ больш у ёй ня друкуюцца, а затое ў кажным нумары *Беларуса* паяўляецца шкодная для нашай Царквы дрэнь, якую прадукуюць бунтаўшчыкі і адшчэпнікі. Др. Ст. Станкевіч, каб жыў, ніколі-б да такой ганьбы не дапусьціў... Выходзіць, што замест бараніць нябожчыкамужа, які яе абароны зусім не патрабуе, сп-ня З. Станкевіч лепш хай абароніць сябе і дасьць беларускай грамадзкасьці на чужыне выясьненьне, чаму яна паставіла атрыманае ў спадчыне па мужу грамадзкае дабро, газэту *Беларус*, на службу дэструктыўным элемэнтам?

– *П. Манькоўскі*

АДШЧЭПНІКІ ВЫМАРОЖЫВАЮЦЬ МІТРАПАЛІТА

КЛІЎЛЕНД, Огаё Пачынаючы з кастрычніка г.г., парафіяльная рада прыходу Жыровіцкае Божае Маці ў Кліўлендзе якая мае абавязак даглядаць будынак і рэзыдэнцыю Мітрапаліта ў Кліўлендзе, перастала гэта выконваць. Быў выключаны газ і электрыка для Мітрапаліта з мэтаю дакучыць 81-гадоваму Мітрапаліту й магчыма выгнаць яго з халоднага будынку.

У сувязі з гэтым, адшчэпнікі перанесьлі сваю кнайпу ў цёплы царкоўны будынак.

ТЭРАРЫЗМ У НЮ ДЖЭРЗІ

****СПРЫНГФІЛД, Мас.**** У сярэдзіне кастрычніка г.г. а. Васіль Кендыш атрымаў ананімны ліст з ваколіцы Ню Брунскіку ў Ню Джэрзі у якім былі прыклееныя тры атручаныя капсулі „Tylenol” і было напісана, пабеларуску, каб ён прыняў дзьве капсулі й даў адну матушцы. „Мы хочам бачыць вас на могілках” закончыў тэрарыст. Паліцыя расьледвае гэтую справу.

У Амэрыцы ўжо памерла сем асобаў ад атручаных капсуляў „Tylenol”.

Хто ідзе за дударом?



5-га верасьня, г.г., у Ню Джэрзі на Сустрэчы Беларусаў Паўночнай Амэрыкі, так-званая й сама-званая „дарадчая камісія” пры былым архіепіскапу БАПЦ, Мікалаю, пастанавіла прасіць Мікалая склікаць іхні адшчэпніцкі сабор.

У Ню Ёрку, Галасуйма за Лермана



Др. Гарошка, рэдактар ЧАСу, спатыкаецца з Лерманам у ягонай перадвыбарчай кватэры.

У Амэрыцы, вельмі часта бывае, што кандыдаты на губэрнатара, маёра, кагрэсмэна, ці інш., выкарыстоўваюць этнічныя групы пад час выбараў, а потым пра іх зусім забываюцца. Сёньня Рэспубліканская Партыя ўжо менш склонная да гэтай тэндэнцыі, бо пры ёй існуе афіцыйны аддзел нацыянальнасьцяў ці этнічных групаў якога няма пры Дэмакратычнай Партыі, і гэты аддзел стала працуе, з пэўнымі посьпехамі, каб не даць кандыдатам забыцца хто іх падтрымоўваў і, у некаторых выпадках, аддзел ставіць свае дамаганьні каторых кандыдаты ўжо лёгка не йгнаруюць.

У Ню Ёрку, Рэспубліканскі Аддзел Нацыянальнасьцяў пад старшынствам М. Сатіраса (Грэка), на сваім паседжаньні 14-га верасьня, г.г., папастанавіў падтрымоўваць Луіса Лермана на губэрнатара штату і, у гэтым самым часе, атрымаў ад сп. Лермана асабістую, неадменную й „вечную” прысягу (калі Лерман выграе выбары) аб стварэньні этнічнай камісіі ў складзе 22 прадстаўнікоў ад розных нацыянальнасьцяў із платным дырэктарам, якая будзе зьбірацца квартальна й будзе радзіць губэрнатару аб праблемах, жаданьнях і патрэбах нацыянальных групаў.

Стварэньне гэтай камісіі будзе важным далейшым поступам у працэсе ўзрастаючага ўплыву нацыянальных групаў на Амэрыканскую палітыку.

Сам сп. Лерман вельмі прыхільна адносіцца да беларусаў і йншых нацыянальных групаў у Ню Ёрку, а ягоны праціўнік, Маріо Куомо, магчыма што нават і ня сьніў аб беларусах.

Дзелягэтага, газэта *Беларускі ЧАС* моцна радзіць усім беларусам галасаваць за Луіса Лермана на губэрнатара Ню Ёрку.

– *Рэдакцыя*

На Ўкраінска-Польскай Канфэрэнцыі

Першая Канфэрэнцыя Ўкраінска-Рольскіх (У-П) Адносінаў адбылася 2-га кастрычніка г.г. ў памешканьні Ўкраінскага Інстытуту ў Ню Ёрку. Да праграмы былі ўключаныя наступныя даклады:

(1) *У-П канфлікты й супрацоўніцтва ў аўстрыйскім парлямэнце*, Праф Б. Цюцюра; (2) *Гістарычныя традыцыі У-П фэдэралізму*, Праф. А. Камінскі; (3) А. Кысіль і праблема *Гэнтэ Рутэнус – Націонэ Польонус*, Праф. Ф. Сысын; (4) *Пілсудзкі й Петлюра*, Праф. П. Вандыч; (5) *У-П адносіны падчас 2-е сусьветнае вайны*, Праф. Т. Гунчак; і (6) *Польскі падыход да змаганьня ўкраінцаў за сваю незалежную дзяржаву*, Др. С. Скшыпэк.

Канфэрэнцыя адбылася на ўнівэрсытэцкім навуковым узроўні й многія даклады, у адзін спосаб ці другі, кранулі беларускія праблемы, асабліва з часоў Вялікага Княства Літоўскага і ў справе „польскіх усходніх граніцаў”. Было адно абмежаваньне: арганізатары рашылі не чапаць сёньняшніх гарачых палітычных справаў бо, як казалася, з гэтага карысьці ня будзе на такой канфэрэнцыі.

Др. Р. Гарошка прывітаў канфэрэнцыю ад беларусаў і коратка вытлумачыў, што мы беларусы ўважаем Вялікае Княства Літоўскае як былую беларускую дзяржаву. У пазьнейшай гутарцы, на гэта былі прыхільныя водгукі ад некаторых украінцаў.

Вельмі прыкра было даведацца, што новы старшыня Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва, Др Кіпель, поўнасьцяй зігнараваў захады арганізатараў канфэрэнцыі (больш як 10 тэлефонаў) каб уключыць у канфэрэнцыю беларусаў.

465 ГАДОЎ БЕЛАРУСКАМУ КНІГАДРУКАВАНЬНЮ

Выданьні ЮНЭСКА пра Францішку СКАРЫНУ

У Парыжы ў 1979 годзе выйшла кніжка пра беларускага першадрукара, Францішку Скарыну, на французкай мове ў выдавецтве ЮНЭСКА і пад аўтарствам вучоных-скарыназнаўцаў з БССР, В. Чамярыцкага, Г. Гагенчанкі ды Ў. Шматава. У 1980 годзе, гэтая кніжка ізноў была выдана ЮНЭСКАМ у перакладзе на ангельскую мову і, такім чынам, набыла яшчэ шырэйшага значэньня.

Пачаткам выданьня кніжкі Чамярыцкага, Гагенчанкі й Шматава, можна лічыць XVI сэсію Генэральнай Канфэрэнцыі ЮНЭСКА (Парыж, 1973), якая прыняла пастанову аб паглыбленым вывучэньні й папулярызацыі культурных дасягненьняў славянскіх народаў.

У дакладнасьці, на сэсіі была прынята пастанова аб выданьні на ўсіх эўрапэйскіх мовах сэрыі: „Вялікія дзеячы славянскай культуры", у якую, побач з М. Ламаносавым, А. Пушкінам і Т. Шаўчэнкам, быў уключаны Францішак Скарына. ЮНЭСКА зьвярнулася да вучоных БССР з просьбай напісаць для гэтай сэрыі навукова-папулярны нарыс пра славутага першадрукара, Ф. Скарыну, асьветніка й гуманіста.

Рукапіс кнігі на беларускай мове быў пасланы ў штаб-кватэру ЮНЭСКА ў Парыж, дзе кніга й убачыла сьвет.

Выданьне складаецца з шасьці невялікіх, але зьмястоўных разьдзелаў. У першым загалоўку – *Беларусь у канцы XV і ў XVI стагодзьдзях* – даецца грунтоўная характарыстыка эканамічных, грамадзка-палітычных і ўзьнімаючых перадумоваў зьяўленьня гуманістычных ідэяў на Беларусі, галоўным правадніком якіх, быў Францішак Скарына.

У другім разьдзеле – *Францішак Скарына, сын са слаўнага гораду Полацку* – апавядаецца пра дзіцячыя й маладыя гады Скарыны ў Полацку, пра яго навуку ў Кракаўскім унівэрсытэце на факультэце свабодных навукаў, аб атрыманьні ім вучонай ступені доктара мэдыцыны ў Падуанскім унівэрсытэце. Артыкулы напісаныя яркімі, старанна падабранымі фактамі, якія добра падкрэсьліваюць тыя або іншыя асаблівасьці жыцьцёвага й творчага шляху будучага першадрукара да пражскага пэрыяду ягонай дзейнасьці.

Аднак, кульмінацыйнымі ў кнізе зьяўляюцца трэці, чацьверты ды пяты разьдзелы, дзе разглядаецца выдавецкая дзейнасьць Скарыны ў Празе й Вільні, што ўславіла яго імя. Гэта паведамленьні пра ягоныя паездкі ў Кэнігсбэрг і Маскву, апісаньне высокага ўзроўня паліграфічнага мастацтва ягоных выданьняў, і аналізы гуманістычных сьветапоглядаў нашага першадрукара. Пры гэтым, дарэчы адзначыць, што аўтары асаблівую ўвагу сканцэнтроўваюць на асьвятленьні найбольш характэрных, або малазразумелых момантаў у дзейнасьці Скарыны. У лягічнай структуры яны імкнуцца адказаць на пытаньне, чаму ягоная дзейнасьць пачалася ў Празе, а не ў Вялікім Княстве Літоўскім, дзе ў той часназіраўся даволі высокі ўзровень разьвіцьця гарадоў, рамесьніцтва, высокі ўзровень мадэрнізацыі гаспадаркі земляробчай у выглядзе агульна-эўрапэйскай і вялікі рост міжнароднага гандлю.

Тым ня менш, арганізаваць „кнігадрукаваньне ў Вялікім Княстве было надзвычай цяжка таму", пішуць аўтары, „што тут адсутнічалі традыцыі кнігадрукаваньня, папера, друкары." Усё гэта ўжо было ў Чэхіі, дзе раней чым у іншых славянскіх краінах узьнікла кнігадрукаваньне на нацыянальнай мове. Да гэтага часу (1505 г.) у Вэнэцыі была выдадзеная чэская Біблія, якая паслужыла асноўнай крыніцай для перакладу Скарынай Бібліі на беларускую мову. Спрыялі тут культурныя й гандлёвыя сувязі Чэхіі й Вялікага Княства Літоўскага.

У кнізе яўна адзначана асьветніцкі характар выданьняў Скарыны. Хоць ён выдаваў Біблію, гэта значыць збор розных твораў, што ляжаць у аснове хрысьціянскага й жыдоўскага культу, ён бачыў у ёй перш за ўсё крыніцу „...зямной мудрасьці, энцыкляпэдыю ведаў", якія маглі быць выкарыстаныя дзеля вывучэньня „сядмі навук вызволеных", гэта значыць: граматыкі, лёгікі, рыторыкі, арытмэтыкі, геамэтрыі, музыкі й астраноміі.

Пражскае выданьне Ф. Скарыны – гэта ўздым нацыянальнага маштабу, яркае выяўленьне высокай культурнай мужнасьці беларускага народу...

Ведама таксама, што ў сярэднявеччы, Біблія, з прычыны яе супярэчлівага зьместу які адлюстроўваў розную клясавую ідэалёгію, ня толькі асьвятляла й апраўдвала сацыяльную няроўнасьць, але й жывіла радыкальна-рэфармацыйныя, гэрэтычныя рухі, накіраваныя супраць фэўдальнага ладу. Не выпадкова адзін з правадыроў Вялікай сялянскай вайны ў Нямеччыне, сучасьнік Скарыны, Томас Мюнцэр (1490-1525), патрабаваў знаёміць веруючых з тэкстам усяе Бібліі. І ня дзіўна, што хрысьціянская царква некаторы час не дазваляла на пераклады й выданьні Бібліі на нацыянальных мовах. Таму пражскае выданьне Скарыны, якое адрозьнівалася ня толькі вольным перакладам біблійных тэкстаў на беларускую мову таго часу, але й сваімі гуманістычнымі камэнтарамі, дало магутны імпульс як разьвіцьцю перадавой грамадзка-палітычнай думкі, так і росту антыфэўдальных рухаў.

Адзначаючы, што на працягу 1517-1519 г.г. Скарына выдаў 23 кнігі Старога Запавету, аўтары выказваюць справядлівае меркаваньне аб тым, што гэта толькі частка дайшоўшых да нас выданьняў беларускага перша-друкара. І хоць „усю прадукцыю Пражскай друкарні Скарыны нельга пакуль-што вызначыць дакладна, многія факты сьведчаць", пішуць вучоныя, „што беларускі асьветнік меў намер выдаць у Празе ўсю Біблію."

Аб гэтым гаворыць агульны загаловачны ўступ ды прадмова „во всю Библию русского языка" і таксама прадмова Скарыны да першых Кніг Царства, у якіх успамінаецца шмат не дайшоўшых да нас або дасюль ня знойдзеных дасьледнікамі кніг з пражскай Бібліі – „Кнігі Ездры", „Товіф" і інш.

Значнае месца ў кнізе ўдзяляецца характарыстыцы выданьняў Францішка Скарыны, што зразумела хаця-б таму, што замежны чытач практычна пазбаўлены магчымасьці пабачыць калі-небудзь кнігі беларускага першадрукара, шэдэўры сярэднявечнага паліграфічнага мастацтва.

Аналізуючы гуманістычны сьветапогляд Ф. Скарыны, аўтары падкрэсьліваюць, што ён меў ідэі, накіраваныя „супраць фэўдальнага зьняволеньня народу". Важнейшай ягонай рысай быў патрыятызм, у якім ня было й ценю нацыянальнай абмежаванасьці. „Ен прызнаваў", пішуць дасьледнікі, „роўнасьць усіх народаў і іх моваў, паважаў ды ўсхваляў лепшыя дасягненьні чалавечай культуры, выказваўся за дружалюбныя адносіны між народамі."

У апошняй, шостай частцы – *Шляхамі Скарыны* – апавядаецца аб разьвіцьці беларускага кнігадрукаваньня ў XVI–XVII стагодзьдзях, аналізуецца дзейнасьць пасьлядоўнікаў першадрукара – С. Буднага і В. Цяпінскага, якія працягвалі як выдавецкія традыцыі, так і гуманістычныя асьветныя ідэі Ф. Скарыны, якія дзеілі на суседнія народы: Расейскі й Украінскі.

Цікавым для замежнага чытача будзе зьмешчанае ў гэтым нарысе паведамленьне аб тым, што на радзіме Ф. Скарыны ў Полацку пастаўлены памятнік беларускаму пршадрукару.

У канцы кнігі знаходзіцца кароткая характарыстыка дасягненьняў беларускага народу ў галіне культуры за часы беларускай гісторыі.

Асьветніцкім гімнам, блізкім па духу да скарынінскага гуманізму, гучаць заключныя словы гэтага выданьня, якія гучаць словам і духам слаўнай беларускай эпохі.

Заслугоўвае добрых слоў і праца перакладчыка Жуля Гаша, які ажыцьцявіў пераклад рукапісу кнігі зь беларускай мовы на французкую. Трэба заўважыць, што на гэтым шляху перад ім стаялі немалыя цяжкасьці, таму, што неабходна было добрае веданьне ня толькі сучаснай беларускай літаратурнай мовы, але і беларускай мовы XIV стагодзьдзя, таму што ўсе цытаты з скарынавых выданьняў і дакумантаў былі на стара-беларускай мове.

– Вячаслаў Шалькевіч
у апрацоўцы В. Пануцэвіча

Lenin offered to establish independent Byelorussia

**PARIS* (AP) – At the end of World War I, Soviet leader Vladimir Lenin offered to surrender four-fifths of the Soviet held territory in exchange for formal recognition of his communist government and economic aid from the West, an American historian says.

President Woodrow Wilson rejected the offer, thereby missing a chance "that would have created historic conditions in which no Russian communist regime could have embarked on a campaign of world conquest," Prof. Eugene Gonda said.

In his book "The Versailles Conference" published here in April 1981, the Hungarian-born Gonda, 72, said that in secret negotiations in 1919 with an American emissary to the Kremlin, Lenin offered to accept the creation of noncommunist states in the Baltic and Archangel regions, western Byelorussia, half of the Ukraine, the Crimea, the Caucasus, the Ural Mountains, and all of Siberia.

In exchange, the Western powers were to recognize the communist government and help in its postwar reconstruction.

The book, written in French, tries to throw new light on the 1919 Versailles Conference ending W.W. I.

Gonda said he based the work largely on unpublished private papers, archives, and official records of the conference. The U.S. Government had no comment on the book.

Gonda said Wilson rejected Lenin's offer because he feared being accused of making a deal with the Bolsheviks at a time when American, British and French expeditionary forces were trying in vain to restore the Czarist regime by force.

ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ

Вельмі цікавы й вартасны гістарычны нарыс пра Сьвіслацкую Гімназію які закранае крыніцы нашага нацыянальнага адраджэньня спалучанага з жыцьцём і рэвалюцыйнай дзейнасьцяй Кастуся Каліноўскага. Апрацаваў В. Пануцэвіч.

У канцы лістападу 1982 г. ў Нью Ёрку адбудзецца Чарговая Сэсія Рады Б.Н.Р.

The Byelorussian Times
ЧАС Двумоўны беларускі часапіс у ЗША
USPS 345–170
9–06 Parsons Blvd.
Flushing, N.Y. 11357
U.S.A.
A Byelorussian Newspaper
Published bimonthly in January, March, May, July, September and November.
Dr. Roger Horoshko, Publisher
Annual Subscription
$8 U.S. currency only
Postmaster:
Send address changes to the BYELORUSSIAN TIMES
Box 141, Whitestone, N.Y. 11357
Second Class Postage Paid at Flushing, N.Y. 11355
„ЧАС"
Двумоўная беларуская газэта
Выходзіць 6 разоў на год у студзені, сакавіку, травені, ліпені, верасьні й лістападзе.
Др. Р. Гарошка, Выдавец
Гадавая Падпіска
8 амэрыканскіх даляраў
У замежнай валюце дабаўце 5 дал. для замены на даляры.

АДКАЗ ПЛЕСКАЧУ...

У артыкуле зьмешчаным у *Беларусе* за месяц чэрвень 1982 г. №№ 301–302, сп. Плескач, не знайшоўшы прычынаў для апраўданьня Ўладыкі Мікалая як галоўнага віноўніка паўстаньня закалотаў у парафіях БАПЦ ў Амэрыцы, у сваім артыкуле „Крызыс у БАПЦ: Што Далей", піша розныя пязгодныя з праўдаю блюзьнерствы.

Напачатку артыкулу ён прабуе абвінавачваць царкоўных дзеячоў за нейкія „амбіцыі" якімі ў сапраўднасьці карыстаецца толькі Ўладыка Мікалай і некаторыя беларускія „дзеячы" з атэістычнымі пераканаьнямі якія, ломячы царкоўныя правілы, хацелі-б кіраваць царквою за пасярэдніцтвам сьвецкіх арганізацыяў.

Да такіх сьвецкіх „дзеячаў" належыць і сп. Плескач для якога БАПЦ ў сапраўднасьці не існуе, бо напрацягу некаторага часу ён з сям'ёю наведваў расейскую царкву, дзе з ягонага дазволу адбыўся й шлюб ягонае дачкі, зьнеслаўляючы гэтым парафію БАПЦ існуючую ў тым часе ў Дэтройце.

Ня менш шкодную дзейнасьць праявіў сп. Плескач у Дэтройце ў часе рукапалажэньня а. Яна Бруцкага ў сьвятары, калі пераняўшы ініцыятыву кіраўніка абрадаў не лічыў абавязкам паведаміць аб рукапалажэньні Правячага Япіскапа і беспраўна сабраў нейкую нараду якая пастанавіла аб годнасьці а. Яна быць япіскапам. Цяпер сп. Плескач і кампанія ня лічаць сваім абавязкам прызнаваць сваю пастанову.

Магістар Плескач, ці як яго некаторыя называюць „магістрат", пішучы, што натоўп кіруецца інстынктам а не правам, гэтым вельмі выразна ахарактарызаваў сучасную сваю бальшыню ў рэлігійным закалоце, бо-ж гэтая ягоная бальшыня не прызнае ні царкоўных правілаў, ні канонаў, ні статуту. Разьмінаецца аўтар і з праўдаю аб тым, што ягоны натоўп аднаўляў, закладаў і будаваў усе парафіі да чаго ён сам абсалютна нічым не прычыніўся й няведае аб тым, што Хрыстос збудаваў сваю Царкву й наставіў кіраўнікамі Яе сьв. Апосталаў.

Аб рэлігійным пераканаьні сп. магістра сьветчаць і ягоныя словы аб тым, што „на Малебні за здароўе Мітрапаліта Андрэя засталося толькі дзьве асобы ў царкве." Ня хоча ён прызнацца ў тым, што гэта сталася пад уплывам так-званых „дзеячоў", якія лічаць, што царква не для таго каб маліцца Богу, а для правядзеньня партыйнай палітыкі й непаладкаў.

Аўтар прызнаецца, што Кліўлендская парафія адна з найбольшых, але не адважваецца выясьніць чаму ў Дэтройскай парафіі парафіянаў можна палічыць на пальцах аднае рукі? А беларусаў у Дэтройце напэўня ня менш як у Кліўлендзе. Не належаць яны да БАПЦ таму, што „лідары" ў Дэтройце не зацікаўленыя рэлігіяю – для іх царква зьяўляецца сымбалічнаю, з чым ня могуць пагадзіцца вернікі ў Дэтройце.

Такія псэўдо-арганізатары ў Дэтройце цяпер заўзята ўзяліся праводзіць разбуральную дзейнасьць у рэлігійным жыцьці БАПЦ, каб зьліквідаваўшы царкву потым стацца арганізатарамі бяздзейных сьвецкіх арганізацыяў.

Аб тым-жа, што рэлігійны канфлікт пачаўся ў парафіі ў Гайлянд Парк кожнаму ведама, але ня ведама тое, чаму так-званыя „лідары" як сп. Плескач, др. Сажыч і ім падобныя пашырылі канфлікт на іншыя парафіі ў Амэрыцы?

Сп. Плескач піша аб „аднабаковым" становішчы газэты *Беларускі ЧАС*, але не заікнецца аб вузка аднабаковым становішчы *Беларуса* й пашквільных і антырэлігійных *Царкоўных Навінах* дзе праводзіцца акцыя супраць БАПЦ.

Успамінае аўтар і аб выданьні „Царкоўнага Бюлетэню" якога выданьне вельмі патрэбнае і неабходнае, але сп. Плескач чамусьці не задумваецца над тым ці ёсьць магчымасьць у сучасным стане гэтую справу рэалізаваць? Бо павінна быць аўтару ведама, што на працягу 25-ці год выданьня *Голасу Царквы* не адзін з нашых псэўдо-дзеячоў не нарупіўся нешта напісаць у часапіс або спрычыніцца да распаўсюджаньня гэтага адзінага рэлігійнага выдавецтва.

Вельмі дзіўна й непрызваіта й тое, што сп. Плескач як магістар шукае нейкага фікцыйнага паразуменьня паміж герархамі не падаючы матыву для развязаньня гэтае пякучае праблемы справядліва й згодна існуючых царкоўных правілаў, а не з асабістымі аднабаковымі развааньнямі як, напрыклад, што канфлікт ня ёсьць прычынаю няладаў у парафіі ў Гайлянд Парку, а віною нашых найвышэйшых уладаў. Ці гэта ня жаданьне аўтара каб канфлікт прадаўжаўся для нейкае таемнае мэты? Бо-ж кожнаму ведама, што мяноўна пачаткам канфлікту была парафія ў Гайлянд Парку й што напэўна канфлікт быў-бы напачатку заладжаны, каб Уладыка Мікалай беспраўна не прычыніўся да пашырэньня канфлікту на іншыя парафіі ў Амэрыцы, нахабна пераймаючы кіраўніцтва ў неналежучых да яго парафіях ды ўзнаўляючы сьвятарскі сан звольненаму Аляксандру Яноўскаму.

Калі-б аўтар артыкулу быў безстаронным ды прыпомніў закалот у бруклінскай парафіі ў 1967 г. то зразумеў-бы, што сучасны канфлікт у БАПЦ ёсьць паўтарэньнем як бы гісторыі канфлікту ў Брукліне. Бо-ж так, як у бруклінскую парафію быў падасланы Архіяпіскапам Іоанам (з юрысдыкцыі Маскоўскае Патрыярхіі) Юры Абрэмскі, які непадпарадкаваўся Архіяпіскапу Васілю й распачаў руйніцкую дзейнасьць, у бруклінскай парафіі, такую самую разбуральную дзейнасьць праводзіць у сучасных закалотах Аляксандар Яноўскі з дапамогаю Ўладыкі Мікалая.

Для доказу падаём тут вытрымкі з №26-га *Голасу Царквы* за сьнежань 1967 году: „Зразумела, што сівер гэты падуў і на нашую сьв. БАПЦ. Падуў і на ўсе нашыя парафіі... У якім сэнсе? У наступным. Паставіць на калені правячага Япіскапа нашае сьв. БАПЦ ў Амэрыцы й Канадзе Ўладыку Васіля й прымусіць яго адыйсьці... А там ужо развал забясьпечаны!

„Праўда, зразумелая й ясная рэч! Нажаль не для ўсіх, навет для дзейных і шчырых нашых аўтакефалістаў гэтая справа ўсё яшчэ не ясная. Ім усё яшчэ здаецца, што тут справа не ў развале сьв. БАПЦ, а ў дзеякіх непаразуменьнях між Царквою Радаю й Уладыкам Васілём. Таму падаём тут дзе якія выясьненьні, тым болей, што правадыры гэтых закалотаў вельмі ахвотна цьвердзяць: *Што, мы хочам разваліць царкву?* (У сучаснасьці цьвердзяць што Ўладыка Мітрапаліт хоча разваліць Царкву). *Мы ў Ягоныя царкоўныя справы не мяшаемся, тады, як ён стала ўмешваецца ў нашыя адміністрацыйныя справы! І тут усябяда. Ня плацім яму? Так ня плацім, бо мы ў царкве гаспадары, а ён ня хоча здаць нам дакумантаў у тым ліку й царкоўную пячатку! Ён уважае сябе настаяцелям, тады як мы назначылі сабе настаяцелям а. Юрыя! Ня нашая гэта справа? Не, нашая бо Ўладыка Васіль не слухае нас. Мы ў Амэрыцы – тут дэмакрацыя, і Ўладыка мусіць слухаць нас, а калі ня хоча, няхай адыходзіць...*

„*Вось-жа як бачыце мы не супраць Уладыкі Васіля, не, і цяпер мы вызнаём яго, толькі няхай зразумее, што мы гаспадары, і ён павінен слухаць нас. Мы яму часта пагражалі, у царкву хацелі не ўпусьціць? А што-ж тут дзіўнага? Чаму ён ня слухае нас?* (У сучасным закалоце ў Кліўлендзе ўжо нават не ўпусьцілі Мітрапаліта ў царкву – рэд.) *Чаму ня хоча зразумець асноваў дэмакрацыі? Не пазволілі Ўладыцы склікаць Надзвычайны Сход? Так не пазволілі, бо дурныя людзі маглі-б паслухаць Яго, і ён меў-бы бальшыню галасоў. Гэта пярэчыць Статуту? Магчыма, але гэта ня важна, бо мы самі Статут.*

„Тут пададзена толькі малая частка бязупыннага ламаньня царкоўных правілаў, закону й Статуту нашае сьв. БАПЦ такімі „гаспадарамі" Але кожнаму павінна быць ведама адкуль падуў вецер на нашую сьв. БАПЦ. А падуў з тога самага цэнтру адкуль дуў у гадох 1912–13, 1922, 1927 і 1946. Гэта той самы вецер на нашую маладую кветку БАПЦ."

А параўнайма толькі, ці цяпер ня тое самае дзеіцца ў нашай БАПЦ? Толькі яшчэ больш рэвалюцыйна бо ўдзельнічае ў закалотах не адна парафія, а некалькі.

Будзем надзеіцца на Бога, які дапаможа нам і цяпер уратаваць наш гонар і нашую славу: БАПЦ. А сівер вернецца на галавы тых, што спрычыніліся да паўстаньня сівeру!

– *Аўтар ведамы рэдакцыі.*

Атрымаў Вышэйшую Асьвету



У гэтым годзе, Леанід Войтэнка, сын Мікалая й Анны Войтэнкаў із Самэрсэту, Ню Джэрзі, выдатна закончыў вышэйшую асьвету на стэйтовым калэджы ў Трэнтане, атрымаўшы навуковы ступень Бакалаўра Прыродных Навук (Bachelor of Science). Леанід ужо дастаў працу на сваім фаху як настаўнік і далей прадаўжае студыі на магістра.

Шчыра жадаем Леаніду посьпехаў у ягонай прафэсыйнай працы й жыцьці. Беларуская грамадзкасьць папоўнілася яшчэ адным сябрам з вышэйшай асьветай.

– *Рэдакцыя*

МІКАЛАЙ СТРУСАВАЎ

****КЛІЎЛЕНД, Огаё**** 8-га кастрычніка г.г. ў Кліўлендзе адбыўся Сабор Япіскапаў БАПЦ на які быў запрошаны быўшы Архіяпіскап БАПЦ Мікалай і яму была дадзена яшчэ адна магчымасьць прадставіць сваю справу й спрабаваць апраўдаць сябе.

Мікалай, адказваючы на паведамленьне аб Саборы, сказаў, што „з прыемнасьцяй" прыедзе на Сабор, але на Сабор не зьявіўся. Падчас сэсіі Сабору быў даручаны ліст ад Мікалая ў якім ён піша, што на Сабор не прыедзе з прычыны нейкіх „іншых справаў".

Мікалай, каторы публічна і ў сваіх „пасланьнях" стала наракае на Мітрапаліта, што Мітрапаліт нібы ня хоча палагодзіць закалот нутраным спосабам, ужо трэці раз не зьявіўся на Сабор Япіскапаў і ўжо тры разы паказаў хто запраўды ня хоча палагодзіць гэтага закалоту нутраным спосабам.

Угодкі Кітайскай Рэспублікі



15-га кастрычніка г.г. на прыняцьці ў Ню Ёрку ў гонар 71-х угодкаў кітайскай рэвалюцыі якая давяла да праглошаньня Кітайскай Рэспублікі (цяпер Тайван). Зьлева направа: сп-ня Гока ад вугорскіх паўстанцаў; сп-ня К. Ц. Дан, жонка кітайскага консула; сп-ня Уліч ад Камітэту Паняволеных Народаў; Др. Р. Гарошка ад *Беларускага ЧАСу* й арг. паняволеных народаў; Консул К. Ц. Дан рэпрэзэнтуючы Кітайскую Рэспубліку; і няведамая асоба.